## Схема аналізу ўрока беларускай мовы

1. Агульныя звесткі пра ўрок: а) школа, б) настаўнік, в) клас, г) колькасць вучняў, д) месца і час правядзення ўрока.

2. Характарыстка ўрока: а) тып урока; б) тэма ўрока, в) месца ўрока (у сістэме ўрокаў раздзела ці тэмы, напрыклад: у раздзеле "Марфалогія", у тэме "Дзеяслоў"), г) падрыхтаванасць настаўніка да ўрока (дошка, наглядныя, тэхнічныя сродкі і інш.); д) падрыхтаванасць класа да ўрока.

3. Структура ўрока: а) этапы, ці структурныя элементы ўрока, б) іх паслядоўнасць і дазіроўка па часе, в) адпаведнасць структуры ўрока яго зместу і мэце.

4. Змест урока: а) адпаведнасць урока прынцыпу навуковасці; б) характарыстыка дыдактычнага матэрыялу да розных этапаў урока і відаў дзейнасці вучняў; в) выхаваўчая накіраванасць урока; г) рэалізацыя прынцыпу сувязі тэорыі з практыкай (выпрацоўка лінгвістычнай і камунікатыўнай кампетэнцый вучняў); д) адпаведнасць зместу ўрока патрабаванням праграмы; е) арганізацыя і патрабаванні да маўленчай дзейнасці вучняў (звязных выказванняў, адказаў на пытанні, пастаноўкі пытанняў вучнямі і інш.); ё) сувязь новага матэрыялу з раней вывучаным; ж) міжпрадметныя сувязі; з) інфармацыйная насычанасць урока; і) спалучэнне індывідуальнай, франтальнай, групавой і калектыўнай формаў работы вучняў на ўроку.

5. Метадычныя асновы правядзення ўрока: а) прыёмы пастаноўкі мэты і задач урока; б) метады і прыёмы, выкарыстаныя на кожным этапе ўрока; в) адпаведнасць метадаў і прыёмаў мэце і задачам урока, яго зместу, узросту і ўзроўню падрыхтаванасці вучняў і іх эфектыўнасць; г) валоданне метадамі актыўнага навучання, мэтазгоднасць іх прымянення на дадзеным уроку; д) выкарыстанне пэўных інавацыйных тэхналогій навучання ці іх элементаў; е) падвядзенне вынікаў урока ў адпаведнасці з пастаўленымі мэтай і задачамі; ё) ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў вучняў (віды, формы, сістэма ацэнкі);

6. Характарыстыка настаўніка: а) змест і форма маўлення (граматнасць, эмацыянальнасць, лексічнае багацце, разнастайнасць сінтаксічных канструкцый і інш.); б) уменне настаўніка трымацца ў класе (упэўненасць, сабранасць, знаходлівасць, ініцыятыўнасць); в) адносіны настаўніка да вучняў (тон, стыль, манера зносін і інш.); г) уменне арганізаваць і стымуляваць да самастойнай актыўнай творчай дзейнасці вучняў; д) бачыць клас і кожнага асобна вучня; е) валоданне матэрыялам, методыкай правядзення ўрока і творчыя знаходкі, ё) педагагічны такт настаўніка.

7. Характарыстыка вучняў: а) актыўнасць класа і асобных вучняў; б) адносіны да прадмета, урока; в) узровень ведаў, уменняў і навыкаў; г) змест і форма маўлення вучняў (правільнасць, дакладнасць, выразнасць, лагічнасць і інш.); д) дысцыплінаванасць і арганізаванасць; е) міжасобасныя адносіны ў класе.

8. Метадычныя вывады пра ўрок: а) уражанне; б) ацэнка; в) парады і пажаданні; г) скарыстанне вопыту для наведвальніка.